У 2016 г. у асноўнай курганнай групе могільніка Наўры былі раскапаны яшчэ два курганы. ***Курган 75*** утрымліваў два сінхронныя пахаванні: пахаванне 1 – пашкоджаная перакопам інгумацыя (мужчына 40–45 гадоў), арыентаваная галавой на захад; пахаванне 2 – крэмацыя (індывід ва ўзросце каля 35 гадоў, пол не вызначаны). ***Курган 70*** утрымліваў пахаванне хлопчыка ва ўзросце каля 12 гадоў, здзейсненае па абрадзе інгумацыі і арыентаванае галавой на захад. Абодва курганы могуць быць датаваныя XI ст.

Курганны могільнік **Кастыкі** (Вілейскі раён Мінскай вобласці) знаходзіцца на правым беразе Віліі ва ўсходняй частцы сучаснай вёскі. Помнік вядомы ў навуковай літаратуры з сярэдзіны XIX ст. У 1856 г. К. Тышкевіч апісваў наяўнасць «мноства» курганоў, адзін з якіх быў ім раскапаны. Да 1973 г. у могільніку налічвалася ўсяго 20 курганоў, 7 з якіх былі раскапаныя Я. Г. Звяругам.

У 2016 г. быў даследаваны адзін курган і прылеглая да яго міжкурганная прастора. Агульная раскапаная плошча склала 184 кв. м. Курган утрымліваў жаночае пахаванне па абрадзе інгумацыі, пашкоджанае перакопам, якое, верагодна, было арыентаванае галавой на захад. Датаванне пахавання можа быць вызначана ў межах XI – пачатку XII ст. Насып кургана складаўся з культурнага слоя селішча з матэрыяламі каменнага, бронзавага і жалезнага вякоў, але, пераважна, трэцяй чвэрці I тыс. н. э. Культурны слой селішча магутнасцю 0,2–0,4 м быў выяўлены і пад даследаваным насыпам.

## РЭКАНСТРУКЦЫЯ АБАРОНЧЫХ ЗБУДАВАННЯЎ МЯДЗЕЛЬСКАГА ЗАМКА (ПРЫКЛАД ВІЗУАЛІЗАЦЫІ ВЫНІКАЎ АРХЕАЛАГІЧНЫХ ДАСЛЕДАВАННЯЎ)

## RECONSTRUCTION OF MYADZEL CASTLE FORTIFICATIONS (EXAMPLE OF ARCHAEOLOGICAL RESEARCH RESULTS VISUALIZATION)

***М. А. Плавінскі, Ю. Л. Уласюк***

***M. Plavinski, Y. Vlasiuk***

*Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт, МДЭІ імя А. Д. Сахарава БДУ,*
*г. Мінск, Беларусь*
*plavinsky_arc@mail.ru*
*Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт, гістарычны факультэт, г. Мінск, Рэспубліка Беларусь*

*Belarusian State University, ISEI BSU, Minsk, Republic of Belarus*
*Belarusian State University, faculty of history, Minsk, Republic of Belarus*

Падводзяцца вынікі распрацоўкі графічных рэканструкцый фартыфікацыі Мядзельскага замка на падставе матэрыялаў археалагічных раскопак.

The article is devoted to summarizing the results of Myadzel Castle fortifications graphic reconstructions development on the basis of archaeological excavations materials.

*Ключавыя словы:* Мядзельскі замак, фартыфікацыя, археалагічныя даследаванні, рэканструкцыя.

*Keywords*: Myadzel castle, archaeological research, fortifications, reconstruction.

Мядзельскі замак размяшчаецца на паўвостраве возера Мястра ў паўднёвай частцы сучаснага Мядзела. Археалагічнае вывучэнне помніка распачаў у 1970 г. М. А. Ткачоў. У 1981 г. ён даследаваў 116 кв.м ва ўсходняй частцы замкавага пагорка і выявіў рэшткі мураванай вежы, якая мела вонкавы дыяметр 17,5 м. У 1982 г. тры невялікія па плошчы шурфы на замкавым пагорку заклаў М. М. Чарняўскі. У 2013 г. раскопкі Мядзельскага замка былі адноўлены экспедыцыяй пад кіраўніцтвам М. А. Плавінскага. На працягу 2013–2015 гг. была даследавана плошча 191 кв.м.

Суаднясенне вынікаў археалагічных даследаванняў і вывучэнне пісьмовых крыніц, якія датычацца Мядзельскага замка (аналіз звестак пісьмовых крыніц ажыццёўлены М. А. Волкавым), дало падставы для рэканструкцыі асноўных этапаў яго гісторыі. На падставе праведзеных даследаванняў можна вылучыць чатыры асноўныя этапы ў гісторыі Мядзельскага замка.

**Этап 1.** На першым этапе (канец XV ст.) на ўсходнім краі замкавага пагорка пачынаецца ўзвядзенне круглай мураванай вежы-данжона. Пачатак яе пабудовы варта, напэўна, звязваць са спробай стварэння цэнтра родавых уладанняў, якая была ажыццёўлена Багданам Саковічам паміж 1484 і 1490 гг. Можна меркаваць, што ўжо з самага пачатку будаўніцтва мураваная вежа мела, найперш, рэпрэзентатыўныя функцыі. Пэўных даных аб характары іншых умацаванняў замка, якія былі ўзведзены на першым этапе яго існавання, у нас пакуль няма. Верагодна, у 20–30-я гг. XVI ст. да вежы з паўночна-заходняга боку была прыбудаваная вялікая жылая драўляная пабудова на мураваным падмурку, якая была абсталяваная кафлянымі печамі. Пабудова была арыентаваная паралельна схілу замкавага пагорка і, верагодна, уваходзіла ў перыметр замкавых умацаванняў.

На першым этапе свайго існавання Мядзельскі замак выконваў функцыі прыватнаўласніцкай рэзідэнцыі. Пры гэтым ён з'яўляецца надзвычай цікавым прыкладам падобнай рэзідэнцыі, якая так і не пераўтварылася ў паўнавартасны цэнтр магнацкай латыфундыі. Прычынай гэтага стала спачатку выміранне роду Саковічаў, а затым і той галіны роду Радзівілаў, якая валодала Мядзелам.

**Этап 2.** Прыкладна ў сярэдзіне XVI ст. ці некалькі пазней у Мядзельскім замку адбываюцца нейкія катастрафічныя падзеі, верагодна, пажар, які прыводзіць да разбурэння вялікай жылой пабудовы і, магчыма, пашкоджанню мураванай вежы. Пасля гэтага на пляцоўцы замкавага пагорка ажыццяўляюцца працы па перабудове, а менавіта, будуюцца паўкруглыя бастэі, адбываецца ўмацаванне схілаў пагорка слоем абпаленай гліны і ўзвядзенне па яго перыметры драўлянага тыну. Верагодна, з унутранага боку да тына былі прыбудаваныя нейкія заглыбленыя ў мацярык драўляныя збудаванні.

Другі этап развіцця фартыфікацыйных збудаванняў Мядзельскага замка прыпадае на час, калі ён пераходзіць ва ўласнасць каралеўскага скарбу ў другой палове 1540-х гг. (пасля смерці Альжбэты Радзівіл з Саковічаў у 1544 г.). Верагодна, з гатага часу замак як жылы і рэпрэзентатыўны комплекс паступова прыходзіць у заняпад. Асноўнай яго функцыяй у другой палове XVI – пачатку/першай палове XVII ст. было забеспячэнне абароны жыхароў мястэчка Мядзел. Пры гэтым замак працягваў захоўваць сваё абарончае значэнне падчас Лівонскай вайны, пра што сведчыць высылка сюды чатырох гармат і значнай колькасці іншай агнястрэльнай зброі з Вільні ў 1564 г.

**Этап 3.** Развіццё замкавых умацаванняў на трэцім этапе можа быць рэканструявана толькі гіпатэтычна. Верагодна, працы па мадэрнізацыі фартыфікацыйных збудаванняў працягваліся і ў другой палове XVI – першай палове XVII ст., калі вакол замка з мэтай павелічэння яго абараназдольнасці быў насыпаны дадатковы земляны вал з бастыёнамі. Разам з тым, дадзеная выснова застаецца толькі гіпатэтычнай, бо пакуль мы не маем ні пісьмовых даных, ні матэрыялаў археалагічных даследаванняў, якія б яе надзейна пацвярджалі. Вядома, што ў 1618 г. у замку адбываецца пажар, які пашкодзіў замкавыя ўмацаванні, але ступень гэтых пашкоджанняў пакуль цяжка вызначыць, а сляды пажару ў культурным слаі помніка на дадзены момант вылучыць пакуль цяжка.

**Этап 4.** Як сур'ёзнае фартыфікацыйнае збудаванне Мядзельскі замак спыніў сваё існаванне, хутчэй за ўсё, у перыяд паміж пажарам 1618 г. і войнамі сярэдзіны XVII ст., а яго тэрыторыя ў далейшым стала выкарыстоўвацца ў гаспадарчых мэтах. У 1735 г. па загадзе цівуна Старога Мядзела Мядзельскі замак быў спалены. Што менавіта было знішчана пажарам невядома, аднак, мяркуючы па наяўных звестках, замкавая зямля ў гэты час арандавалася жыхарамі Старога Мядзела, што сведчыць аб магчымасці размяшчэння там нейкіх малазначных гаспадарчых пабудоў. Пасля спалення ў 1735 г. тэрыторыя замка, верагодна, была канчаткова закінутая іператварылася ў ворыўныя палеткі жыхароў мястэчка.

Археалагічнае вывучэнне Мядзельскага замка ў 2013–2105 гг. было адноўлена з мэтай вызначэння стратыграфіі культурнага пласта і планіграфіі замкавага пагорка, а таксама выяўлення канструктыўных асаблівасцей яго абарончых умацаванняў. Вынікі гэтых даследаванняў павінны былі стаць падставай для навукова абрунтаваных рэкамендацый па распрацоўцы праектнай дакументацыі і планаванні прац па стварэнні на замкавым пагорку музея пад адкрытым небам. На дадзены момант распрацоўка праекта музеефікацыі Мядзельскага замка адкладзена на няпэўны тэрмін. Разам з тым, аналіз вынікаў археалагічных раскопак розных гадоў і вывучэнне звестак пісьмовых крыніц, а таксама праца па рэканструкцыі магчымага знешняга выгляду замкавых умацаванняў не спыняецца.

У межах гэтай працы адным з аўтараў дадзенага паведамлення была створана серыя графічных рэканструкцый, якая дазваляе ўявіць магчымы знешні выгляд замка. Так, большасць графічных работ прысвечана адлюстраванню знешняга выгляду замка на другім і трэцім этапах яго гісторыі. Адсутнасць графічных рэканструкцый замкавых умацаванняў першага і чацвёртага перыядаў тлумачыцца тым, што на дадзены момант вельмі цяжка ўявіць іх магчымы знешні выгляд (за выключэннем толькі вежы і будынка, размешчанага на паўночны захад ад яе). Створаныя графічныя рэканструкцыі адлюстроўваюць магчымы вонкавы выгляд фртыфікацыйных збудаванняў замка – мураванай вежы, бастэй, усталяванага па перыметры замкавага пагорка тыну. На адной з рэканструкцый адлюстраваны трэці этап гісторыі замкавых умацаванняў, калі вакол Мядзельскага замка была ўзведзена новая бастыённая лінія ўмацаванняў.

Практычнае значэнне старэння серыі графічных рэканструкцый Мядзельскага замка закючаецца ў магчымасці іх выкарыстання ў далейшай распрацоўцы канцэпцыі і праектнай дакументацыі па музеефікацыі дадзенага помніка. Акрамя таго, графічныя рэканструкцыі могуць разглядацца як самастойныя мастацкія аб'екты і экспанавацца ў якасці асобнай выставы ці ў межах ужо існуючых музейных экспазіцый.